ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (1220) ● 16 лістапада 1978 г. Цана 2 кап.

## САСТАЎ ПАРТКОМА БДУ

**ГАРАШЧУК Міхаіл Сцяпанавіч** — сакратар парткома.

**ЖУК Аркадзь Паўлавіч** — намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце.

**КАЗЛОЎ Міхаіл Кандрацьевіч** — намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце.

**БЕЛЫ Уладзімір Аляксеевіч** — рэктар універсітэта, адказны за пытанні перспектывы развіцця універсітэта.

**БЕЛЕНЬКІ Ілья Іванавіч** — адказны за работу з маладымі камуністамі, за вядзенне партыйнай гаспадаркі і кантроль за выкананнем рашэнняў партыйных органаў.

**ГОЛУБЕВА Ірына Рыгораўна** — адказная за спартыўна-масавую работу.

**ДУБАВЕЦ Пётр Азаравіч** — адказны за арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва і спартыўна-масавую работу.

**ДЗЯМЧУК Міхаіл Іванавіч** — адказны за навуковую работу навукова-даследчых інстытутаў і за работу з маладымі вучонымі.

**КАСПЯРОВІЧ Ала Станіславаўна** — адказная за работу груп народнага кантролю.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Марыя Віктараўна** — адказная за работу з кураторамі, ідэйна-выхаваўчую работу сярод студэнтаў.

**МЯДЗВЕДЗЕЎ Генадзь Аляксеевіч** — адказны за стан навуковай работы.

**РУСАКОВА Алена Міхайлаўна** — адказная за арганізацыю палітычнай адукацыі.

**РАМАНОЎСКІ Іван Фёдаравіч** — адказны за стан работы таварыства «Веды», лекцыйную прапаганду і друк.

**РАБЧЫНСКАЯ Ірына Анатольеўна** — адказная за арганізацыю культурна-масавай работы.

**САЛАЎ Пётр Лаўрэнцьевіч** — адказны за арганізацыю шэфскай работы.

**ЦІКАВЫ Вадзім Фёдаравіч**—адказны за стан матэрыяльна-тэхнічнай базы і перспектыву яе развіцця.

**ТОЗІК Анатолій Афанасьевіч** — адказны за інтэрнацыянальнае выхаванне і работу грамадскіх арганізацый.

**ШУКАНАЎ Адам Сямёнавіч** — адказны за ідэйна-выхаваўчую работу ў студэнцкіх інтэрнатах.

**ЯНЧАНКА Сцяпан Яфімавіч** — адказны за стан вучэбнай работы.

## ГІСТОРЫЯ МУЖНАСЦІ

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка на нашым курсе быў праведзен планавы семінар па абмеркаванню кніг Л. І. Брэжнева «Малая зямля» і «Адраджэнне».

Спачатку перад студэнтамі выступіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Герой Савецкага Саюза генерал-лейтэнант Іосіф Сямёнавіч Жыгараў. На прыкладзе баявога шляху сваёй брыгады ён яскрава намаляваў старонкі мужнасці і гераізму нашых воінаў у гады вайны. Крок за крокам ад пачатку і да самых апошніх дзён вайны перад намі разгортвалася гісторыя мужнасці нашай Радзімы. Асэнсоўваючы той час, Іосіф Сямёнавіч абапіраўся на кнігу Л. І. Брэжнева «Малая зямля» як на праўдзівы прыклад служэння справе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, справе нашай Радзімы. Пасля выступлення І. С. Жыгарава студэнты задавалі яму шмат пытанняў аб Вялікай Айчыннай вайне і сучасным палітычным становішчы ў свеце. Сабраўшыяся горача дзякавалі дарагому госцю за яго выступленне і пажадалі далейшых поспехаў у справе служэння нашай Айчыне.

З абмеркаваннем кнігі Л. І. Брэжнева «Малая зямля» выступілі студэнты IV курса. Яны падкрэслілі вялікую каштоўнасць гэтага твора.

Вялікую дапамогу ў правядзенні семінара аказалі дацэнт кафедры палітэканоміі сацыялізму В. І. Цакунова, выкладчык гэтай кафедры В. К. Харашун, метадыст нашага факультэта А. А. Крэмнеў.

У канцы семінара Вольга Іванаўна Цакунова адзначыла, што такія мерапрыемствы садзейнічаюць выхаванню ў нашай моладзі якасцей, неабходных для грамадзяніна камуністычнай будучыні.

**В. КАНЮШКЕВІЧ,**
**студэнт IV курса біяфака.**



Лабараторную работу па фізічнай хіміі выконваюць студэнткі 2 групы III курса хімфака С. Ануфрыева і А. Кухарчык.
Фота **М. Дубовіка.**

## У ПАРТЫЙНЫМ КІРАВАННІ— СІЛА КАМСАМОЛА

СПРАВЫ камсамольскія

Камсамольская арганізацыя кафедры фізікі паўправаднікоў сустракае 60-годдзе БССР і Кампартыі Беларусі не толькі значнымі поспехамі ў працы і вучобе. Адной з асноўных сваіх задач па азнаменаванню юбілею мы лічым глыбокае вывучэнне гістарычнага вопыту партыі, прапаганду дасягненняў нашай рэспублікі. Партыйная група і камсамольскае бюро кафедры вырашылі арганізаваць для камсамольцаў кафедры школу будучага камуніста. Камуністы кафедры ўзялі здзяйсненне гэтай ідэі пад свой кантроль. Кіруе школай камуніст Т. С. Працько, праграма школы абмеркавана на сходзе партгрупы.

«Фарміраваць камуністычную ідэйнасць — гэта значыць узбройваць камсамольцаў — юнакоў і дзяўчат — глыбокім разуменнем законаў грамадскага развіцця, веданнем гістарычнага вопыту КПСС, гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы і сацыялістычнага будаўніцтва, вучыць самастойна разбірацца ў складаных і шматаблічных з'явах сучаснай рэчаіснасці». Гэтыя словы першага сакратара ЦК ВЛКСМ Б. Н. Пастухова на XVIII з'ездзе Ленінскага камсамола адлюстроўваюць мэты і задачы нашай школы. Яе слухачы — камсамольскі актыў кафедры паўправаднікоў. Рэгламент работы школы наступны: заняткі праводзяцца раз у месяц, першая палова заняткаў — лекцыя, другая — семінар. Запланаваны лекцыі аб актуальных пытаннях міжнароднага камуністычнага руху, аб гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі, аб задачах камсамольцаў і г. д.

Першыя заняткі школы адбыліся ў канцы кастрычніка. Аб праграме нашай партыі расказала выкладчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў Г. А. Калініна. Затым у ходзе ажыўленай дыскусіі слухачоў былі закрануты шматлікія пытанні міжнароднага камуністычнага і рабочага руху. З няменшай цікавасцю слухачы ставіліся да даклада сакратара камітэта камсамола універсітэта А. А. Тозіка «Задачы камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна ў сувязі з 60-годдзем ВЛКСМ». Камсамольцаў цікавіла ўсё: ідэйна-палітычнае выхаванне моладзі, станаўленне маладога спецыяліста ў ВНУ, унутрысаюзная работа і многае іншае. На свае пытанні яны атрымалі вычарпальныя, змястоўныя адказы.

На прыкладзе партыі камсамол вучыцца па-камуністычнаму жыць і працаваць. Таму маладым ленінцам неабходна не проста веданне асноўных палажэнняў Статута і Праграмы КПСС, а глыбокае разуменне таго, як яны гістарычна склаліся, якія надзённыя і перспектыўныя задачы яны ставяць перад камуністамі і ўсім савецкім народам.

Немагчыма пераацаніць значэнне глыбокага і сістэматычнага засваення марксісцка-ленінскага вучэння — галоўнага компасу на шляху да камунізму. Уменне разумець і прымяняць стратэгію і тактыку партыі дапаможа кожнаму камсамольцу яшчэ актыўней укладваць свае сілы і энергію ў выкананне рашэнняў гістарычнага XXV з'езда Камуністычнай партыі.

Лекцыі і семінарскія заняткі ў школе будучага камуніста будуць праводзіць вопытныя лектары, выкладчыкі кафедр грамадскіх дысцыплін. У маі плануюцца выніковыя заняткі-залік, якія вызначаць найбольш актыўных слухачоў, выявяць засваенне імі пройдзенага матэрыялу. Асноўнай задачай школы будучага камуніста мы лічым уменне на практыцы прымяняць атрыманыя веды, весці прапагандысцкую работу ў групах.

Уладзімір Ільіч Ленін пісаў, што ўся ідэйна-палітычная работа камсамола павінна быць пабудавана так, «каб, вучачыся, арганізоўваючыся, згуртоўваючыся, змагаючыся... моладзь выхоўвала б сябе і ўсіх тых, хто ў ёй бачыць правадыра, каб яна выхоўвала камуністаў» (ПЗТ, т. 41, стар. 308). Гэты ленінскі наказ выконваецца так: у 1977 годзе ў цэлым па краіне 73 працэнты папаўнення партыі склалі члены ВЛКСМ, што характарызуе камсамол як асноўны рэзерв партыі. XVIII з'езд камсамола адзначыў, што «камітэты камсамола павінны дакладней і больш строга падыходзіць да рэкамендацыі членаў ВЛКСМ у партыю». І мы вырашылі: рэкамендацыю ў партыю даваць толькі тым, хто паспяхова здасць залік.

Выхоўваць у моладзі камуністычную перакананасць, пралетарскі інтэрнацыяналізм, высокую арганізаванасць і асабістую дысцыплінаванасць, весці дзейсную прапаганду дасягненняў і пераваг сацыялістычнага ладу, на аснове марксісцка-ленінскага вучэння фарміраваць у кожнага маладога чалавека палітычную культуру, маральную чысціню, актыўную жыццёвую пазіцыю—вось дэвіз кожнага маладога ленінца, дэвіз нашай школы.

**В. АДЖАЕЎ,**
**сакратар камсамольскай арганізацыі,**
**М. СОБАЛЕЎ,**
**парторг кафедры фізікі паўправаднікоў.**

На студэнцкі савет

# Я Б У ЛЕКТАРЫ ПАЙШОЎ...

Вы памятаеце гора-лектара з кінакамедыі «Карнавальная ноч», які напярэдадні Новага года спрабаваў вырашыць пытанне «Ці ёсць жыццё на Марсе?» А мы ж часткова калегі з ім.

Летам, у час праходжання практыкі, нашы студэнты па пуцёўках таварыства «Веды» выступаюць перад самымі разнастайнымі калектывамі, прапаноўваючы ім не менш разнастайныя тэмы. Была нават такая: «Сям'я — першы выхавацель», прызначаная для калектыву настаўнікаў сярэдняй школы. І, калі верыць водгуку, «лекцыя прайшла на высокім узроўні, слухачы засталіся задаволены. Узнік шэраг пытанняў, на якія лектар даў грунтоўныя адказы». Застаецца толькі здзіўляцца падобнай кампетэнтнасці студэнта журфака.

А вось А. Козел, цяпер студэнт II курса, умудрыўся на сваёй першай практыцы прачытаць лекцыю «Імперыялізм — крыніца войн» на зернетаку племсаўгаса «Высокаўскі» усяго за 15 мінут. Пры гэтым, як сведчыць водгук, «лектар паказаў вялікія веды палітычнай абстаноўкі»...

Па слоўніку Ушакова лекцыя — гэта публічнае чытанне на якую-небудзь тэму. Не ведаю, ці бралі нашы студэнты за аснову сцвярджэнне Ушакова, але лекцыі чыталіся сапраўды на «якую-небудзь» тэму.

На сцэнах сельскіх клубаў і на прадпрыемствах раённых цэнтраў учарашнія школьнікі вяшчалі аб імперыялізме, каланіялізме і іншых «ізмах». Тэматыка, бясспрэчна, цікавая, патрэбная, але... патрабуючая пэўнай падрыхтоўкі. Многія са студэнтаў бралі тэмы непасільныя, не маючы дастатковага ўзроўню ведаў для іх асвятлення.

А калі даведваешся, дзе толькі не гучала лекцыя аб нашым факультэце: і перад рабочымі кансервава-гароднінасушыльнага камбіната, і перад рабочымі «Сельгастэхнікі», і ў інтэрнаце бавоўнапрадзільнай фабрыкі і г. д. — становіцца нейк не па сабе. Больш дарэчы, на мой погляд, было б выступіць з ёй у школе, у воінскай часці — там, дзе многія яшчэ не вызначылі свой жыццёвы шлях.

Чаму ж адбываюцца ўсе гэтыя непаразуменні? Ды таму, што вельмі цьмяныя ўяўленні ў нас аб тых патрабаваннях, якія прад'яўляюцца да лекцыі. Нас не вучаць выбіраць тэмы выступленняў. Мы ніводнага разу не бачылі прадстаўнікоў таварыства «Веды». А ім ёсць што параіць, падказаць нам, прапанаваць спіс літаратуры па тэмах, расказаць аб дыферэнцыраваным падыходзе да аўдыторыі.

Акрамя гэтага неабходнага мінімуму, патрэбна і наша жаданне. Няўжо гэта так складана — захацець, каб цябе слухалі, расказаць тое, што цікава табе, і ва ўзнагароду ўбачыць бляск у вачах, а не апушчаныя патыліцы.

А чаго ж грахі таіць, нярэдка выпадае і такое. Прыходзяць нашы студэнты да кіраўнікоў, і адбываюцца там прыкладна такія дыялогі:

— Вось лекцыі абавязалі прачытаць.

— Слухай, дарагі, табе што, даведка патрэбна?

— Пуцёўкі адзначыць.

— Тры хопіць?

— Ой, што вы, дзвюх дастаткова!

І пытанне вырашана.

Да наступнай практыкі засталося восем месяцаў. Гэта нямнога, калі ўлічыць, колькі трэба зрабіць, каб не паўтарыліся нашы промахі. Не хочацца мне быць падобным на лектара-недавучку, якому так і не ўдалося выявіць, ці ёсць жыццё на Марсе...

**Л. ЧЫЖОВА,**
студэнтка журфака.

**АД РЭДАКЦЫІ:**

Думаем, што праблема, якую закранула аўтар матэрыялу, хвалюе і нашых чытачоў. Лекцыя як элемент грамадска-палітычнай практыкі... Якой яна павінна быць? Чакаем вашых пісьмаў, разважанняў, прапаноў.



У лінгафонным кабінеце займаюцца першакурснікі фізічнага факультэта. Фота М. Дубовіка.

# БЫЦЬ НА СВАІМ МЕСЦЫ




— Імем Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік...

Гучаць словы прыгавору. Я бачу, як услухоўваецца ў іх высокая бялявая дзяўчына-практыкантка, што ўважліва сачыла за ўсім ходам судовага разбору, за работай пракурора, суддзі, адваката.

Мяне яна вельмі зацікавіла. Шмат добрага расказаў аб студэнтцы намеснік дэкана юрфака. І таму пасля заканчэння працэсу я падышоў да яе, каб пазнаёміцца бліжэй.

І вось знаёмлю яе з чытачамі газеты: Варвара Кавалёва, ленінскі стыпендыят, студэнтка чацвёртага курса юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

**— Скажы, калі ты вырашыла пайсці вучыцца ва універсітэт на юрыдычны? Што паслужыла штуршком да гэтага? Наколькі я ведаю, у вашай сям'і і да гэтага часу юрыстаў не было.**

— Мара звязаць сваё жыццё з працай юрыста паявілася ў мяне яшчэ ў школьныя гады. Але канчатковае рашэнне прыйшло пасля таго, як пазнаёмілася з кнігай Б. Палявога «Нюрнбергскія дзённікі». Я ў школе вучылася нядрэнна, але пасля таго, як рашэнне было прынята, пачала яшчэ больш настойліва авалодваць навукамі — юрыст павінен быць адукаваным, эрудзіраваным. Скончыла школу на выдатна і паступіла.

**— Ці лёгка давалася вучоба на першым курсе?**

— Вядома, не вельмі. Але дапамагалі старшакурснікі, ды і выкладчыкі растлумачвалі матэрыял даходліва. Асабліва хочацца адзначыць дапамогу А. В. Дулава, прафесара, загадчыка кафедры крыміналістыкі і І. І. Гарэліка, прафесара, загадчыка кафедры крымінальнага права.

**— Ці хапае табе часу займацца грамадскай дзейнасцю (Варвара — намеснік камсорга групы) і вучыцца толькі выдатна?**

— Хапае, калі ўважліва слухаеш і запісваеш лекцыі, калі любіш сваю будучую прафесію.

**— Што асабліва запомнілася за час студэнцкага жыцця?**

— Увогуле кажучы, запомнілася усё. Але калі ўдакладніць, то — першая сесія. Колькі трывог, колькі хваляванняў! Потым яшчэ — ССГА, першая практыка, якую я праходзіла у Ленінскім раённым нарсудзе г. Мінска... Шмат чаго!

**— І ў заключэнне, Варвара, твае пажаданні першакурснікам.**

— Галоўнае — пераканацца ў тым, што жыццёвая дарога выбрана правільна, таму што чалавек не на сваім месцы — клопат для грамадства.

**С. ПРЫЕМКА.**

**Утульны пакой дружбы інтэрната № 7 ледзь умясціў усіх жадаючых прысутнічаць на чарговым пасяджэнні клуба «Палітыкас», які быў створан у інтэрнаце ў мінулым семестры. Сюды прыходзяць студэнты і аспіранты розных нацыянальнасцей, якія займаюцца у БДУ і іншых ВНУ г. Мінска, — людзі, якім неабыякавы лёс нашай планеты, — каб абмяняцца думкамі і паспрачацца аб палітычных праблемах сучаснасці. Тэма палітдыскусіі выбіраецца большасцю галасоў на папярэднім пасяджэнні клуба. У мінулым семестры была асабліва цікавай сустрэча, прысвечаная в'етнама-кампучыйскім адносінам. Аб праблемах сучаснай Афрыкі расказвалі прадстаўнікі Гвінеі, Малі, Эфіопіі. На наступным пасяджэнні клуба гаворка будзе ісці аб сучаснай Кубе.**

**Халім БАДОВІ,**
**член клуба «Палітыкас».**

**На здымку:** у час чарговага пасяджэння.

**Фота М. Дубовіка.**



# РЭКАМЕНДАЦЫІ

## ПА ПРАВЯДЗЕННЮ ГАДАВОЙ ЗВЕРКІ САСТАВУ ВЛКСМ У КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

Адпаведна Інструкцыі ЦК ВЛКСМ «Аб уліку членаў ВЛКСМ і парадку выдачы камсамольскіх дакументаў узору 1975 года» ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях краіны праходзіць з 1 лістапада гадавая зверка.

Гадавая зверка саставу ВЛКСМ заклікана палепшыць работу камсамольскіх арганізацый з кожным камсамольцам, выканаць важнейшыя патрабаванні Статута ВЛКСМ, падабраць кожнаму члену ВЛКСМ камсамольскае дaручэнне, якое адпавядала б яго схільнасцям, інтарэсам, здольнасцям, каб, выконваючы гэтае даручэнне, камсамолец авалодаў новымі ведамі, навыкамі арганізатара грамадска карысных спраў, атрымаў палітычную загартоўку, прынесіў карысць калектыву, сваім таварышам.

Перш чым пачаць зверку саставу ВЛКСМ, неабходна падрабязна праінструктаваць камсамольскі актыў аб мэтах зверкі і парадку яе правядзення. Кожны камітэт камсамола факультэта, падраздзялення павінен скласці графік правядзення гадавой зверкі саставу ВЛКСМ. Графік і адказныя за правядзенне зверкі павінны быць зацверджаны на пасяджэнні камітэта камсамола.

**Кожны адказны за падрыхтоўку і правядзенне зверкі ў пярвічнай арганізацыі павінен забяспечыць якаснае правядзенне гэтай работы, унясенне змен ва ўліковыя карткі членаў ВЛКСМ, а таксама прыняць меры да ліквідацыі недахопаў, якія ўскрыты ў ходзе зверкі.**

**Пачынаючы гадавую зверку саставу ВЛКСМ, сакратар камітэта камсамола, сакратар камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы, аддзела, кафедры павінен выявіць, ці ўсе камсамольцы стаяць на ўліку ў арганізацыі. Для гэтага неабходна звязацца з аддзеламі кадраў (для к/а супрацоўнікаў і падраздзяленняў) і дэканатамі (для студэнцкіх к/а). Павінны быць складзены адпаведныя спісы.**

**Членаў ВЛКСМ, якія не састаяць на камсамольскім уліку, пасля гутаркі з імі паставіць на пастаянны або часовы ўлік у камітэце камсамола універсітэта. У выпадку, калі камсамолец нясвоечасова стаў на камсамольскі ўлік, пытанне аб парушэнні камсамольскай дысцыпліны павінна быць разгледжана на пасяджэнні бюро, камітэта камсамола або на камсамольскім сходзе.**

У ходзе правядзення гадавой зверкі сакратары камсамольскіх арганізацый павінны:

— сустрэцца і пагутарыць з кожным членам ВЛКСМ, праверыць яго камсамольскі білет, удакладніць, як працуе або вучыцца камсамолец, як выконвае грамадскае даручэнне. Калі камсамолец не меў даручэння, выявіць, чым ён цікавіцца, падабраць яму даручэнне. Усе змены, якія адбыліся ў камсамольцаў у родзе заняткаў, адукацыі, партыйнасці, выконваемай грамадскай рабоце і г. д., унесці ў карткі асабістага ўліку ўстаноўленай ЦК ВЛКСМ формы;

— выявіць, хто з камсамольцаў змяніў прозвішча, і прыняць меры да таго, каб усе члены ВЛКСМ — жанчыны, якія змянілі свае прозвішчы ў сувязі з замужаствам, змянілі ў камітэце камсамола універсітэта камсамольскія дакументы;

— разабрацца з усімі камсамольцамі, якія згубілі камсамольскія білеты або ўліковыя карткі, і разгледзець іх асабістыя справы на сходах; выпіскі з пастаноў сходаў па данаму пытанню прадставіць у камітэт камсамола універсітэта;

— разабрацца з камсамольцамі, якія маюць запазычанасць па членскіх узносах больш трох месяцаў, абмеркаваць гэтыя факты на сходзе і вызначыць, у выпадку неабходнасці, тэрміны пагашэння гэтай запазычанасці;

— устанавіць, колькі маладых камуністаў або кандыдатаў у члены КПСС, выбраных на камсамольскую работу, не састаяць на камсамольскім уліку, і прыняць рашэнне бюро камітэта камсамола аб выдачы ім камсамольскіх дакументаў;

— разабрацца з членамі ВЛКСМ, якія выбылі з арганізацыі, але не зняліся з уліку. Належыць адразу ж прыняць меры да выяўлення іх месцазнаходжання, паведаміць аб гэтых членах ВЛКСМ у камітэт камсамола універсітэта, у выпадку неабходнасці звязацца з рай(гар)ваенкаматамі, бацькамі і г. д.

Калі член ВЛКСМ мае спагнанне з занясеннем ва ўліковую картку, на сходзе неабходна разгледзець пытанне аб магчымасці яго зняцця.

Вынікі зверкі ў камсамольскіх арганізацыях факультэтаў і падраздзяленняў павінны разглядацца на пасяджэннях камітэтаў камсамола.

У дзень зверкі ў камітэце камсамола універсітэта павінны быць вырашаны наступныя пытанні:

**1. Усе камсамольцы, якія не састаяць на ўліку, павінны быць пастаўлены на ўлік. Адпраўлены пісьмы ў райкомы, гаркомы, на тэрыторыі якіх у гэты час працуюць або вучацца члены ВЛКСМ, выбыўшыя без зняцця з уліку.**

**2. На падставе картак асабістага ўліку ва ўліковыя карткі членаў ВЛКСМ павінны быць унесены ўсе змены, якія адбыліся ў камсамольцаў у родзе заняткаў, партыйнасці, адукацыі, выконваемай грамадскай рабоце. Неабходна таксама зрабіць адзнакі аб узнагародах і захвочваннях, аб зняцці спагнанняў.**

**3. Камуністы, выбраныя на камсамольскую работу, павінны стаць на камсамольскі ўлік у камітэце камсамола універсітэта.**

**4. Члены ВЛКСМ, якія змянілі свае прозвішчы, павінны замяніць камсамольскія дакументы.**

Зверка саставу ВЛКСМ прапаноўвае замацаванне дысцыпліны і арганізаванасці ў радах ВЛКСМ. Галоўная ўвага ў ходзе гадавой зверкі павінна быць ўдзелена прыцягненню да работы ўсіх камсамольцаў, а не на выключэнне з радоў ВЛКСМ. Таму пры разглядзе асабістых спраў камсамольцаў неабходна забяспечыць чулыя і ўважлівыя адносіны да лёсу кожнага члена ВЛКСМ.

Камітэт камсамола універсітэта падкрэслівае, што якаснае правядзенне гадавой зверкі саставу ВЛКСМ дазволіць прыцягнуць да работы ў камсамольскіх арганізацыях членаў ВЛКСМ, якія не маюць камсамольскіх даручэнняў, своечасова не сталі на ўлік, палепшыць колькасны і якасны састаў камсамольскіх арганізацый факультэтаў і падраздзяленняў.

**Арганізацыйны аддзел камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна.**

# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

**ВЫПУСК № 17**

## ДА СПРАВАЗДАЧ І ВЫБАРАЎ

Старшыні груп народнага кантролю факультэтаў і іншых падраздзяленняў звяртаюцца ў галаўную групу народнага кантролю універсітэта з пытаннямі, якія датычаць прадстаячых справаздач і выбараў у органы народнага кантролю. Калі яны адбудуцца, ці можна перавыбраць старшыню ГНК, калі ў новым саставе партыйнага бюро намеснікам па народнаму кантролю выбран іншы таварыш, ці дазваляецца выбраць новых народных кантралёраў замест тых, якія выбылі з універсітэта па розных прычынах або не спраўляюцца са сваімі грамадскімі абавязкамі, ці трэба загадзя рыхтавацца да справаздач і выбараў?

Як ужо адзначалася на нарадзе старшынь груп у канцы мінулага навучальнага года і ў выпуску № 16 «Старонкі народнага кантролю» («Беларускі універсітэт», 30 сакавіка 1978 г.), паўнамоцтвы ГНК, якія былі выбраны ў красавіку—маі 1978 года, прадоўжаны да таго моманту, калі па рашэнню камітэта народнага кантролю СССР будзе праведзена справаздачна-выбарная кампанія ў органах народнага кантролю. Такая адтэрміноўка перавыбараў абумоўлена тым, што распрацоўваецца і ў канцы гэтага года будзе прынят новы Закон аб народным кантролі ў СССР, і пажадана правесці выбранне новага саставу ГНК у адпаведнасці з патрабаваннямі ўказанага Закона.

Маецца на ўвазе, што справаздачы і выбары ў групах народнага кантролю будуць праведзены праз некалькі месяцаў пасля прыняцця Закона аб народным кантролі (тэрміны справаздачна-выбарнай кампаніі будуць вызначаны кампетэнтнымі органамі). Аднак ужо цяпер трэба рыхтавацца да справаздачна-выбарных сходаў (або канферэнцый). Для гэтага неабходна актывізаваць дзейнасць груп народнага кантролю, улічваючы патрабаванні новай Канстытуцыі, клапаціцца аб выкананні ўсіх мерапрыемстваў, вызначаных планам работы, звярнуць увагу на дзейснасць праверак (у шэрагу выпадкаў яна яшчэ нізкая), часцей інфармаваць калектыў аб прынятых па выніках праверак мерах. Належыць удакладніць абавязкі народных кантралёраў (у кожнага павінна быць пастаяннае даручэнне па здзяйсненню кантролю за тым ці іншым бокам дзейнасці універсітэта).

Прааналізаваўшы работу членаў груп народнага кантролю, ужо цяпер належыць падумаць над тым, каго выбраць на новы тэрмін, а каго не рэкамендаваць для выбрання. Лепшых народных кантралёраў належыць заахвоціць (напрыклад, узнагародзіць Ганаровай граматай універсітэта, факультэта). Вопыт кантралёраў, добра выконваючых свае абавязкі, пажадана абагульніць і прапагандаваць на старонках шматтыражкі, у насценгазетах, на стэндах груп народнага кантролю. Наогул трэба ўсямерна выкарыстоўваць усе сродкі галоснасці, узмацніць іх (зараз праводзіцца універсітэцкі, а потым будуць праведзены раённы і гарадскі агляды сродкаў галоснасці ў органах народнага кантролю).

Па пытаннях перавыбрання старшыні групы народнага кантролю і давыбрання новых членаў замест тых, якія выбылі, трэба звяртацца ў партыйнае бюро і галаўную групу народнага кантролю. Парадак адклікання народных кантралёраў, якія не справіліся са сваімі абавязкамі, і давыбрання замест іх новых ужо тлумачыўся ў артыкуле намесніка сакратара парткома універсітэта па народнаму кантролю (ён быў змешчан у № 11, 1978 г. газеты «Беларускі універсітэт»).

**І. ЦІШКЕВІЧ,**
**старшыня ГНК БДУ.**

## ВЫНІКІ

### ПРАВЕРКІ СТАНУ ВУЧЭБНАЙ І МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ НА ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ.

Вынікі праверкі стану вучэбнай і метадычнай работы на завочным факультэце, праведзенай сектарам вучэбнай работы ГНК, сведчаць аб тым, што на завочным факультэце вялікая ўвага ўдзяляецца пытанням навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу. За апошні час тут назапашан значны вопыт работы.

З 3 277 студэнтаў, здаўшых зімовую сесію, 225 здалі экзамены на выдатна, 1098—на добра і выдатна. У летнюю сесію з 3 216 студэнтаў на выдатна здалі 44 студэнты, на добра і выдатна — 521.

У 1977-78 навучальным годзе рэзка павысілася паспяховасць на аддзяленні біялогіі, што звязана, у першую чаргу, з тым, што асноўная маса студэнтаў на гэтым аддзяленні працуе па спецыяльнасці. Аднак на некаторых аддзяленнях паспяховасць нізкая. Гэта датычыцца аддзялення геаграфіі і рускай мовы і літаратуры, дзе 30 працэнтаў студэнтаў маюць нездавальняючыя адзнакі.

Вялікая колькасць студэнтаў гэтых аддзяленняў прынята з прадпрыемстваў, не маючых адносін да выбранай спецыяльнасці. Так, на аддзяленні рускай мовы і літаратуры з 477 студэнтаў 216 чалавек працуюць не па спецыяльнасці.

Тэрміны ліквідацыі запазычанасцей студэнтамі ў цэлым выконваюцца. Прадаўжэнне тэрмінаў здачы робіцца толькі па ўважлівых прычынах.

Належыць адзначыць вялікую работу дэканата завочнага факультэта па павышэнню паспяховасці і ліквідацыі запазычанасцей студэнтамі.

Па выніках летняй сесіі было выключана каля 30 студэнтаў.

Дэканат завочнага факультэта праводзіць вялікую работу па павышэнню дысцыпліны студэнтаў. На кожным аддзяленні маюцца журналы ўліку наведвання студэнтамі лекцый і іншых заняткаў. За пропускі заняткаў студэнты строга караюцца.

У адпаведнасці з тыпавымі вучэбнымі планамі на завочным факультэце дэканатам штогод складаецца рабочы план для кожнага курса (па кожнаму аддзяленню). Такі план выдаецца кожнаму студэнту. Акрамя агульнаадукацыйных лекцый, студэнты слухаюць лекцыі па пытаннях методыкі самастойнай работы, па пытаннях, звязаных з пошукам вучэбнай і навуковай літаратуры ў бібліятэках.

На завочным факультэце ў цэлым строга выконваюцца правілы рэцэнзіравання пісьмовых работ. Аднак бываюць выпадкі парушэння тэрмінаў праверкі работ. Так, напрыклад, кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў часта парушае тэрміны рэцэнзіравання работ. Маюць месца выпадкі, калі кантрольныя работы перадаюцца асабіста выкладчыкам.

На завочны факультэт паступае 12 тыс. работ на аднаго работніка ў год. Пры такім вялікім аб'ёме работы дэканату неабходна мець загадчыка канцылярыі, які б займаўся пытаннямі афармлення дакументацыі. Некаторыя кафедры парушаюць тэрміны праверкі работ (напрыклад, кафедра працоўнага права). У некаторых выпадках рэцэнзіі не ўскрываюць недахопаў рэцэнзуемых работ. Загадчыкам кафедр неабходна часцей ставіць пытанне аб якасці і тэрмінах рэцэнзавання выкладчыкамі работ. Трэба адзначыць, што многія выкладчыкі нясвоечасова забіраюць работы на рэцэнзаванне. Так, выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў і кафедры беларускай мовы і літаратуры нават пасля некалькіх паведамленняў дэканата завочнага факультэта не забіраюць работ на рэцэнзаванне. Некаторыя выкладчыкі не прытрымліваюцца тэрмінаў рэцэнзавання. Так, прафесар Ф. М. Нячай рэцэнзаваў кантрольную работу з 25 мая па 25 чэрвеня.

Вучэбна-метадычнай літаратурай студэнты-завочнікі забяспечаны недастаткова. З-за недахопу паперы кафедры не могуць індывідуалізаваць у патрэбных выпадках тэматыку работ, колькасць варыянтаў кантрольных заданняў нярэдка абмежавана, і часам адзін варыянт задання даецца на акадэмічную групу, што, натуральна, параджае несамастойнасць выканання.

У некаторых выпадках заявы на ратапрынтнае выданне падрыхтаваных лекцый або метадычных распрацовак для студэнтаў-завочнікаў значна скарачаюцца, а часам не задавальняюцца зусім.

Забяспечанасць аўдыторыямі студэнтаў-завочнікаў у перыяд сесіі недастатковая. Размеркаванне месц у інтэрнатах праводзіцца без ведама дэканата, што прыводзіць у некаторых выпадках да парушэння парадку засялення студэнтаў-завочнікаў у інтэрнаты.

Сектар вучэбнай работы ГНК БДУ рэкамендуе:

— дэканату завочнага факультэта і кафедрам весці сістэматычную работу па далейшаму павышэнню паспяховасці і паляпшэнню наведваемасці заняткаў студэнтамі-завочнікамі. У першую чаргу гэта датычыцца аддзялення геаграфіі, рускай мовы і літаратуры;

— па прычыне нізкай паспяховасці, звязанай з тым, што многія студэнты працуюць не па спецыяльнасці, палепшыць кантынгент паступаючых на завочны факультэт;

— дэканату своечасова выключаць студэнтаў, якія не здалі запазычанасць ва ўстаноўлены тэрміны;

— кафедрам своечасова і якасна рэцэнзаваць кантрольныя работы;

— па прычыне вялікай колькасці кантрольных работ (12 тыс. у год на аднаго работніка), паступаючых на завочны факультэт, неабходна ўвядзенне штатнай адзінкі загадчыка канцылярыі;

— вучэбнаму аддзелу універсітэта аказаць неабходную дапамогу завочнаму факультэту па забеспячэнню аўдыторыямі ў перыяд сесіі;

— адміністрацыі студэнцкага гарадка сумесна з дэканатам навесці парадак па прадастаўленню месц у інтэрнатах студэнтам-завочнікам.

**Л. КІРЫЛА,**
**В. ШАБАНАВА,**
**А. МІНКОВІЧ,**
**члены ГНК БДУ.**

## ПАЛАЖЭННЕ

### АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ СРОДКАЎ ГАЛОСНАСЦІ ГРУП НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ.

У адпаведнасці з пастановай Мінскага гарадскога камітэта народнага кантролю і бюро гаркома ЛКСМБ «Аб правядзенні гарадскога агляду сродкаў галоснасці органаў народнага кантролю, штабаў і атрадаў «Камсамольскага пражэктара» ў БДУ з 20 па 31 лістапада праводзіцца агляд сродкаў галоснасці груп народнага кантролю.

**Мэта агляду:**

— далейшае ўдасканаленне пастаноўкі галоснасці кантролю як важнейшага прынцыпу дзейнасці груп і пастоў народнага кантролю, штабаў і атрадаў «Камсамольскага пражэктара»;

— правядзенне шырокай растлумачальнай работы па выкарыстанню форм і сродкаў галоснасці і паляпшэнню галоснасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі пастановы ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР»;

— абагульненне назапашанага вопыту работы груп і пастоў народнага кантролю, штабаў і атрадаў «Камсамольскага пражэктара» і выяўленне новых форм работы ў гэтым напрамку;

— прапаганда лепшых форм і метадаў правядзення праверак, аглядаў і рэйдаў;

— сувязь органаў народнага кантролю, «Камсамольскага пражэктара» з калектывам і грамадскімі арганізацыямі універсітэта.

**Падвядзенне вынікаў.**

Пры падвядзенні вынікаў агляду камісія прымае пад увагу наступнае:

— наяўнасць стэндаў і асвятленне на іх работы груп народнага кантролю, штабаў і атрадаў «Камсамольскага пражэктара»;

— мастацкае афармленне, змест і перыядычнасць выпуску сатырычных лісткоў, «маланак», сатырычных плакатаў, фотаабвінавачванняў і фотагазет;

— прапаганда лепшых форм і метадаў правядзення праверак, аглядаў, рэйдаў, выкананне народнымі кантралёрамі пастаянных даручэнняў;

— разгляд на сходах ГНК, у штабах «КП» матэрыялаў праверак, рэйдаў, азнаямленне з прымаемымі адміністрацыяй мерамі па ліквідацыі недахопаў;

— перыядычнасць публікацый матэрыялаў аб рабоце народных кантралёраў у факультэцкім насценным друку і ў шматтыражнай газеце «Беларускі універсітэт»;

— работу сектараў галоснасці ГНК і штабаў «КП», актыўнасць членаў сектараў.

Для правядзення агляду сродкаў галоснасці зацверджана камісія ў саставе: В. Яноўскі — старшыня, Г. Ільяшчук— нам. старшыні, А. Андрэеў, Я. Тарасевіч, І. Літвіноўскі, В. Радзіёнаў, Э. Пястоўская, Г. Васільева, Г. Шумак, А. Аладзін.

# Восеньскі традыцыйны



Мнагалюдна было ў гэты дзень на алеях парку Перамогі ля Камсамольскага возера. Тут сабраліся мацнейшыя бегуны універсітэта на свой восеньскі традыцыйны крос у праграме круглагадавой спартакіяды БДУ, прысвечанай 60-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

У спаборніцтвах прыняло ўдзел каля 1500 студэнтаў. Нягледзячы на халоднае, ветранае надвор'е, на дыстанцыях кросу разгарнулася вострая, напружаная барацьба.

Сярод мужчын на дыстанцыі 1000 м доўгі час лепшым быў вынік бегуноў з журфака А. Веруша і М. Касяка — 2.55,0. Стартавалі гісторыкі, і іх прадстаўнік А. Жыльскі паляпшае вынік — 2.51,0. Аднак не ім суджана было перамагчы. Усё вырашылася ў забегу мацнейшых, дзе знаходзіліся члены зборнай БДУ.

Перамогу атрымаў Аляксандр Кекала, выпускнік фізічнага факультэта. Яго вынік — 2.42,0 Толькі дзве секунды ўступілі яму Уладзімір Валчок (біяфак) і Вячаслаў Скварчэўскі (гістфак). У абодвух вынік 2.44,0.

Сярод жанчын на дыстанцыі 500 м перамагла Людміла Чурсіна (хімфак) — 1.32,5. Другой на фінішы была А. Сімановіч (гістфак) — 1.33,0. Трэцяй — Т. Мальчэўская (юрфак) — 1.34,0.

У агульнакамандным заліку перамаглі бегуны гістфака — 82,6 ачка. На прызавых месцах — каманды біяфака — 79,3 ачка і хімфака — 77,5.

**Н. МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

Забег на дыстанцыю 1000 м. Фота **В. Маскалёва.**



# Другое агульнакаманднае

Адным з лепшых стартаў у летнім сезоне гэтага года для красменаў БДУ сталі спаборніцтвы на першынство горада Мінска сярод ВНУ. Гэтыя старты былі прысвечаны 60-годдзю Ленінскага камсамола. На дарожках парку імя Чалюскінцаў сем каманд вялі ўпартую барацьбу за перамогу.

Сярод дзяўчат на дыстанцыях 500 і 1000 м мацнейшымі былі студэнткі БДІНГ. У мужчын на дыстанцыі 3000 і 5000 м перамаглі студэнты ІФК.

Добрыя вынікі паказалі і многія члены зборнай універсітэта. У першую чаргу неабходна адзначыць студэнтку мехмата Святлану Янушкевіч, якая выступала на дыстанцыі 500 м. Вынік у яе — 1 мін. 32 сек. Гэта толькі на 8 сек. больш, чым у пераможцы — студэнткі інстытута народнай гаспадаркі Галіны Кушнаровай.

Нядрэнныя паказчыкі на дыстанцыі 1000 м у Славы Скварчэўскага (гістфак) — 2 мін. 50 сек., а таксама ў Сяргея Бондара — 2 мін. 51 сек. Такія выпадкі далі ім магчымасць у асабістым заліку ўвайсці ў дзесятку мацнейшых.

На заключным этапе спаборніцтваў былі праведзены забегі ў мужчын на 3000 і 5000 метраў. За каманду БДУ на гэтых дыстанцыях выступалі першаразраднікі Аляксандр Жыльскі (гістфак), Уладзімір Зябко (юрфак), Аляксандр Кекала (фізфак). Іх упэўненае выступленне дало магчымасць зборнай універсітэта заняць агульнакаманднае 2-е месца. Першынство заваявала каманда ІФК. І толькі некалькі ачкоў прайграла ёй каманда універсітэта. Трэцяе месца ў студэнтаў БПІ.

Прыемна адзначыць, што зборная БДУ вось ужо другі год запар на такіх спаборніцтвах займае 2-е месца. Гэта гаворыць аб тым, што падрыхтоўка спартсменаў вядзецца на належным узроўні. Немалая заслуга ў гэтым трэнераў В. Я. Шпігава і В. В. Зарэцкай.

**А. ВЕРУШ,**
**М. КАСЯК,**
**удзельнікі кросу.**



**Мінулым летам клубам турыстаў-альпіністаў БДУ былі арганізаваны паходы па Усходняму Каўказу. Гэты ўчастак асвойваўся нашымі турыстамі ўпершыню. Было створана дзве групы, кіраўнікамі якіх сталі К. Салак і В. Машчанка.**

**Фота А. Сыркіна.**

## ПА БДУ інфармацыя

# Сустракаючы свята...

На гістарычным факультэце прайшла студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная юбілею камсамола.

З уступным словам выступіў старшыня СНТ, выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі В. М. Пісараў.

Глыбокім і змястоўным было выступленне студэнта трэцяга курса, аднаго з удзельнікаў алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» 1978 года Міхаіла Стральца. У сваім дакладзе ён раскрыў тэму «Ленін аб задачах камуністычных Саюзаў моладзі». М. Стралец расказаў аб выкананні гэтых задач моладдзю краіны, аб іх самаадданай працы на ўдарных камсамольскіх будоўлях і калгасных палях, у студэнцкіх аўдыторыях і на прамысловых прадпрыемствах, аб іх пошуках і знаходках.

З вялікай цікавасцю слухалі прысутныя даклад студэнта А. Грыцанава «Барацьба рэвалюцыйных сацыял-дэмакратычных партый Расіі за студэнцкую і вучнёўскую моладзь у перыяд утварэння партыі». Яго выступленне — гэта дэталёвы аналіз дзейнасці камсамольцаў і моладзі ў пачатку XX стагоддзя.

Не менш цікавымі былі выступленні намесніка старшыні СНТ факультэта А. Рубанава і студэнта С. Комкіна.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# З пазіцый сучаснай думкі

«Творчасці — ўсё жыццё»— так называецца кніга кандыдата філалагічных навук В. В. Няфёдава, якая была выпушчана выдавецтвам БДУ імя У. І. Леніна. У ёй аўтар афіцыйна вырашае праблематыку сувязі жывапісу з мастацтвам слова: ён не робіць агульных супастаўленняў, смела шукае жывапісца ў літаратуры. Работа напісана з пазіцый сучаснай літаратуразнаўчай і крытычнай думкі.

Кніга «Творчасці — усё жыццё» дапаможа маладому пісьменніку павысіць майстэрства, завострыць яго ўвагу да драбнейшых дэталей тэксту ў іх эмацыянальна-эстэтычнай функцыі.

У літаратурных мініяцюрах даходліва разглядаецца творчы вопыт класікаў літаратуры і вядомых сучасных пісьменнікаў — Пушкіна, Чэхава, Бальманта, Буніна, Талстога, Ахматавай, Эрэнбурга, Сакалова-Мікітава, Берастава.

Кніга В. В. Няфёдава «Творчасці — усё жыццё» патрэбна пісьменнікам і педагогам, студэнтам, усім, хто цікавіцца літаратурай, майстэрствам слова.

**С. ХАДАСЕВІЧ,**
**ст. рэдактар выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна.**

# Пасвячэнне ў студэнты

Чацвёртае лістапада надоўга запомніцца студэнтам-першакурснікам факультэта журналістыкі. На факультэце адбыўся вечар пасвячэння ў студэнты. Пасля ўрачыстай часткі перад студэнтамі выступілі прадстаўнікі кожнага курса факультэта з канцэртнымі праграмамі. Найбольшую цікавасць у зале выклікала выступленне студэнтаў другога курса.

Разам з савецкімі студэнтамі ў першакурснікі былі ўрачыста залічаны і студэнты з замежных краін: Конга, НДРЙ, Манголіі, Грэцыі.

Яны таксама прапанавалі сваю канцэртную праграму, якая вельмі спадабалася гледачам. Найбольшыя апладысменты заслужыла выступленне студэнта з Конга П'ера Кубіка.

Наперадзе — першая сесія. Пажадаем жа студэнтам-першакурснікам поспехаў у вучобе!

**А. ЦВЯХ.**

# Штаб АКА

Са справаздачай аб рабоце штаба аператыўнага камсамольскага атрада універсітэта выступіў яго камандзір В. Навакоў. Ён адзначыў добрую работу аператыўнай групы інтэрната № 7 (камандзір І. Бруеў). У прыклад таварышам былі пастаўлены камсамольцы-аператыўнікі А. Усеня, А. Траццякоў, В. Кішко і іншыя, якія на працягу ўсяго года актыўна выконвалі свае абавязкі.

Аператыўнік — ганаровае званне. Стаць ім можа толькі добрасумленны камсамолец, барацьбіт за грамадскі парадак. І таму невыпадкова на сходзе было закранута пытанне аб прыёме новых членаў у атрад.

Штаб прыняў і зацвердзіў план работы атрада. Запланавана праводзіць рэйды-праверкі ў інтэрнаце сумесна з камітэтам камсамола і «КП» універсітэта. Арганізоўваць лекцыі аб ахове парадку і папярэджанні злачынстваў.

**П. РАМАНЧУК.**


## Паважаныя таварышы!

**Працягваецца падпіска на шматтыражную газету Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна «Беларускі універсітэт» на 1979 год.**

**Аформіць падпіску можна ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку па месцу работы або вучобы.**

**Падпісная цана на год—1 рубель.**


Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**

Заказ № 1642. **Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ** АТ 03636